Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Чэрвені мужчыну пакаралі 50 базавымі штрафу на чырвоную паласу на прыпынку

29.01.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Віктар Лагуцін

У судзе Чэрвенскага раёна 29 студзеня разглядалася крымінальаня справа, узбуджаная супраць менчука Віктара Лагуціна па артыкуле 341 Крымінальнага кодэксу (Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці). Лагуціна абвінавацілі ў тым, што намаляваў на прыпынку паласу чырвонага колеру.

Справу разглядаў суддзя **Анатоль Чаркоўскі.** Пракурор – **Васіль Вярбіцкі.**

Згодна з абвінавачваннем, **Віктар Лагуцін** пятага снежня 2020 года намаляваў чырвоную паласу на прыпынку ў вёсцы Смагароўка ў Чэрвенскім раёне, што "істотна знізіла эстэтычныя каштоўнасці прыпынку". Матэрыяльная шкода, нанесеная дзеяннямі Лагуціна, была ацэнена ў 8 рублёў 84 капейкі.


Віктар віну цалкам прызнаў, таму суд прайшоў вельмі хутка – усяго за 25 хвілін. Да суда абвінавачаны знаходзіўся на волі.

Пракурор запрасіў пакараць Лагуціна штрафам у памеры 50 базавых велічынь (1450 рублёў). Адвакатка Віктара падчас спрэчак звярнула ўвагу на змягчаючыя абставіны: Віктар мае траіх дзяцей, у тым ліку з інваліднасцю, не прыцягваўся раней да адміністрацыйнай адказнасці (акрамя парушэнняў ПДД).

У выніку суддзя Чаркоўскі вынес такі прысуд, як і прасіў пракурор: **50 базавых велічынь штрафу (1450 рублёў).**

Твитнуть







Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул


"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17

ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітзняволеных знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY